№4 студзень 2007

www.saligorsk.org

Свабодны Салігорск

незалежная газета

выдаецца пры падтрымкі “Маладога Фронта”

КДБ ЗРЫВАЕ АКЦЫІ Ў ПАДТРЫМКУ ДАШКЕВІЧА НА САЛІГОРШЧЫНЕ

20-га студзеня а 16-й гадзіне на салігоршчыне меў адбыцца шэраг мерапрыемстваў у падтрымку зьняволенага па палітычных прычынах лідэра Маладога Фронту Зьмітра Дашкевіча.

Былі заплянаваныя пікеты ў Салігорску, Слуцку, Любані, Старобіне, Старых Дарогах, Магілеве. Ідэя была падтрыманая Беларускім Моладзевым Рухам Амэрыкі, які зьбіраўся пікетаваць пасольства Расеі ў Ню-Ёрку. Дзеля акцый на салігоршчыне былі адмыслова падрыхтаваныя транспаранты з надпісамі "СВАБОДУ ДАШКЕВІЧУ", надрукаваныя ўлёткі ды абвесткі. Аднак у пляны Салігорскай філіі Маладога Фронту ўмяшаўся камтэт дзяржбясьпекі ды міліцыя...

Яшчэ напярэдадні, 17 студзеня, у Магілеве на чыгуначным вакзале быў затрыманы сябра Маладога Фротну Азараў Максым, які прыйшоў да цягніку забраць перададзеныя салігорскімі маладафронтаўцамі матэрыялы для пікетаваньня. Ня мінула і трох хвілін, як хлопец быў затрыманы і дастаўлены ў пастарунак, дзе яго пратрымалі 6 гадзін і адпусьцілі толькі ў чатыры гадзіны раніцы. Зразумела, усё што ён меў пры сабе было незаконна канфіскавана. З гэтага моманту стала відавочна, што аб акцыі вядома спэцслужбам, таму ўвечары 18-га студзеня салігорскім адздзяленьнем Маладога Фронту быў зроблены шэраг заяў для прэсы аб плянуемых акцыях.

20-га студзеня падзеі пачалі разгортвацца як у амэрыканскім фільме пра шпіёнаў. Зранку, з мэтаю правесьці прэвэнтыўныя мерапрыемствы, палітычнанебясьпечную салігорскую школу №4, дзе навучаюцца браты Шылы, найбольш актыўныя маладафронаўцы Салігорску, наведалі супрацоўнікі міліцыі. А ўжо а дванаццатай гадзіне пачалася спэцапэрацыя Салігорскага РАУС пад кіраўніцтвам КДБ. Ля дому, дзе месьціца офіс салігорскай суполкі МФ, былі затрыманыя Ільля Шыла і Андрусь Тычына. Яшчэ двум маладафронтаўцам удалося зьехаць на таксі, на што спэцслужбамі тэрмінова была ўведзеная ў дзеяньне апэрацыя "Перахват" і аддадзены прыказ па рацыі аб затрыманьні таксоўкі. Па чыстае выпадковасьці маладзёны даведаліся аб гэтым і пасьпелі пакінуць машыну за дзьвесьці мэтраў да яе затрыманьня. Тым часам Андрусь і Ільля былі дастаўленыя ў пастарунак, дзе ў іх былі незаконна канфіскаваныя расьцяжкі й улёткі.
А 14 гадзіне ля цэнтарльнага рынку сем міліцыянтаў пыталіся затрымаць яшчэ трох маладафронтаўцаў, што зьбіраліся разгарнуць там транспарант “СВАБОДУ ДАШКЕВІЧУ”

Працяг на 2 старонке

КАЛІ СЫТУАЦЫЯ НЯ ЗЬМЕНІЦЦА, СЛУЦКІ ЦУКРОВЫ ЗАВОД СПЫНЕЦЦА 10 ЛЮТАГА

Наступствы цукровай праблемы ўжо адчулі на сабе простыя беларусы, напрыклад, супрацоўнікі КУСП «Бярозаўскае», якім напярэдадні Новага года частка зарплаты выдалі салодкім пяском - мяшком цукру вагай у пяцьдзесят кіляграмаў, які ацанілі ў 78 тысяч рублёў.
А наколькі сур'ёзнымі наступствамі абвінецца гэтая праблема для цукровых заводаў і для людзей, якія на іх працуюць? Ці спынена вытворчасьць? Ці атрымліваюць людзі зарплату? Ці будуць яе выплачваць цукрам? І што адбудзецца, калі сытуацыя ня зьменіцца ў бліжэйшы час?
На пытаньні адказвае галоўны інжынэр найбуйнейшага беларускага цукровага завода ААТ «Слуцкі сахара-рафінадны камбінат» Юрый Сьцяпанавіч ГАРБАТКА.
Па першае спадар Гарбатка паведаміў, што завод працягвае працаваць, прычым на поўную магутнасьць. Ні на адныя суткі вытворчасьць цукру не спынялася.
- Зарплату, вядома, выплачваюць. У нас самая высокая зарплата па канцэрне “Белдзяржхарчпрам”, самая высокая сярод усіх цукровых заводаў Беларусі. І ў Слуцкім раёне мы таксама на першым месцы. Сярэдняя зарплата на нашым заводзе - каля 900 тысяч рублёў.
Але ня ўсё так радужна. Юрый Сьцяпанавіч таксамі паведаміў, што пытаньне аб выплаце зарплаты цукрам пакуль не стаіць, але ж усе склады ўжо даўно цалкам заваленыя.
- Калі сытуацыя ня зьменіцца, што вы будзеце рабіць далей?

Працяг на 2 старонке

Шоў Беларушчыны ў Салігорску

Сёньня ў адной з школаў Салігорску "маладафронтаўскі спэцназ" правёў ажно тры Шоў Беларушчыны. Эмоцыі,перамогі і паразы,сьмех,спрэчкі і "Жыве Беларусь" усім клясам па заканчэньні. Невялічкі фотарэпартаж.

Шоў Беларушчыны ў адной з Салігорскіх школ

Працяг на старонке 2

Больш Беларушчыны!

Сёньня Салігорскі "Малады Фронт" распачаў збор подпісаў пад зваротам да старшыні райвыканкаму з прапановай правесьці шэраг мерапрыесваў,асноўнай мэтай якіх ёсьць папулярызацыя беларускае мовы і культуры.

"У гэтым годзе адзначаецца 125-ці годдзе з дня нараджэньня двух выдатнейшых клясікаў беларускае літаратуры-Янкі Купалы і Якуба Коласа.Гэтыя людзі большую частку жыцьця прысьвяцілі развіцьцю і папулярызацыі нашае мовы і культуры. На вялікі жаль, тыя пытаньні і праблемы, якія стаялі перад Коласам і Купалй стагодзьдзе таму, не згубілі сваёй актуальнасьці і сёньня.

Мы жыхары горада Салігорску, прапануем правесьці ў 2007 годзе ў нашым горадзе шэраг мерапрыемстваў, асноўнай мэтай якіх будзе папулярызацыя беларускае мовы і фармаваньне нацыянальнае самасьвядомасьці ў маладога пакаленьня беларусаў.

1. Правесьці беларусізацыю грамадзкага транспарту(агучваньне прыпынкаў на беларускай мове, зьўленьне беларускамоўнага раскладу руху аўтобусаў)
2. Правесьці літаратурны конкурс “Мова маіх продкаў” у навучальных установах гораду.
3. Прысьвяціць некалькі артыкулаў у газэце “Салігорскі Веснік” гісторыі Случчыны, беларускай мове,культуры і традыцыям.
4. Правесьці ток-шоу на тэлеканале СТК па праблеме моўнага пытаньня з запрашэньнем прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці Салігорску, мовазнаўцаў, гісторыкаў." пішацца ў звароце.

Каардынатары акцыі плянуюць зьбіраць подпісы, ладзіць пікеты да прыканца лютага. Зьвязацца зь імі можна па тэлефонах:370-02-04, 379-58-99 ці праз эл.пошту salihorsk@gmail.com

КАЛІ СЫТУАЦЫЯ НЯ ЗЬМЕНІЦЦА, СЛУЦКІ ЦУКРОВЫ ЗАВОД СПЫНЕЦЦА 10

-Калі сытуацыя ня зьменіцца, што вы будзеце рабіць далей?

-Мы будзем працаваць прыкладна да 10 лютага, каб перапрацаваць усе запасы бурака. А вось што потым - пытаньне складанае. Калі ня будзе рэалізацыі цукру ў Расеі, значыць, завод прыйдзецца спыніць, каб не працаваць сабе ў страту. Тады мы будзем займацца рамонтам завода і рэалізацыяй цукру на ўнутраным рынку. Але мы ўсёткі вельмі спадзяемся, што пытаньне вырашыцца на працягу студзеня.

Тым часам цукровыя заводы арандуюць склады па ўсёй рэспубліцы. Праблему, дзе захоўваць прадукцыю, зараз вырашаюць і на іншых цукровых заводах. На ААТ «Жабінкаўскі цукровы завод» распавялі наступнае:

- Мы разьмяшчаем сваю прадукцыю на складах, якія арандуем па ўсёй рэспубліцы, усюды, дзе толькі можам знайсьці, - у Брэсьце, Гомелі, Койданаве, Оршы. Тавар залежваецца, гэта дрэнна. Але мы працягваем працаваць і спадзяемся, што дамоўленасьць будзе дасягнутая ў бліжэйшы час, - гаворыць намесьнік дырэктара Аляксандар Васільевіч Еўтуховіч.

На гэты час беларускі бок ужо панес каля двух мільёнаў даляраў страт. У Беларускай цукровай кампаніі заяўляюць:

- Расейскія прадпрыемствы, якія атрымлівалі прадукцыю беларускіх цукровых заводаў, вельмі заклапочаныя дадзенай сытуацыяй. Яны зацікаўленыя ў тым, каб працаваць далей - бо беларускі цукар вельмі добрай якасьці. Што кранаецца страт, якія панес беларускі бок, яны ўжо складаюць больш двух мільёнаў даляраў. Хутчэй усяго, пытаньне вырашыцца на гэтым тыдні. Па папярэдняй інфармацыі, будзе дазволены пропуск пяці вагонаў беларускага цукру ў Расею ў суткі (раней у суткі - да сарака).

P.S. Як стала вядома 12 студзеня дазвол на ўвоз пяці вагонаў у суткі беларускага цукру ў Расію атрыманы. Учора першыя вагоны ўжо перасеклі расійскую мяжу. Аб гэтым «Камсамолцы» распавялі ў Беларускай цукровай кампаніі. Але ж пытаньне аб дасягнеьні былога ўзроўню паставак дасюль ня вырашына.

Паводле “КП в Беларусі”

КДБ ЗРЫВАЕ АКЦЫІ Ў ПАДТРЫМКУ ДАШКЕВІЧА НА САЛІГОРШЧЫНЕ

Аднак хлопацам пашчасьціла схавацца ў рынкавым натоўпе.

А палове 15 на галоўнай плошчы Салігорску былі затрыманыя супрацоўнікамі ў цывільным Іван Шыла і Зьміцер Карноў. Хлопцы пасьпелі разьмесьціць расьцяжку, але ж не прастаялі і хвіліны.

Тым часам у офісе Салігосркае філіі Маладога Фронту адбыўся ператрус і былі канфіскаваныя ўлёткі, балёнчыкі з краскай і брашуры па правах непаўнагадовых, выдадзеныя пры дапамозе Беларускага Хельсінскага Камітэту па правох чалавека.

Як адзначылі ўсе затрыманыя, на іх аказваўся моцны псыхалягічны ціск, міліцыянты брудна лаяліся, пагражалі, адмаўлялі непаўнагадовым у прозьбах паведаміць бацькам аб затрыманьні. Некаторых хлопцаў нават зьбівалі. Пратрымаўшы затрыманых па тры гадзіны ў пастарунку і сканфіскаваўшы расьцяжкі і ўлёткі ўсіх непаўнагадовых адпусьцілі, а на 18-гадовага Зьмітра Карнова склалі пратакол аб дробным хуліганстве па 156 артыкуле і 21 студзеня быў асуджаны на трое сутак адміністрацыйнага арышту.

- Напэўна спэцслужбамі праслухоўваліся тэлефоны, бо аб акцыі да 18-га студзеня ніхто ня ведаў, а яшчэ 17-га было затрыманьне ў Магілеве. Да таго ж аб існаваньні офісу і яго месцазнаходжаньні таксама ніхто раней ня ведаў, бо ён быў арэндаваны толькі за дзень да акцыі 19-га студзеня, а ўжо 20-га там дзяжурылі міліцыянты. Сапраўды, такога бязьмежжа ў Салігорску не было ўжо месяцы два, а тэлефоны не праслухоўваліся, напэўна, з часоў выбараў 2006 года. Прынамсі на нашым настроі гэта не як не адаб'ецца. У любым выпадку ўсё заплянаванае бліжэйшым часам будзе зроблена. Моладзь ніколі не пакіне сам насам сваіх лідэраў. Мы будзем штодзень змагацца за свабоду Зьмітра Дашкевіча і іншых палітвязьняў. Яшчэ, безумоўна, шкада, што міліцыянтам прыходзіцца выконваць тую брудную справу, якую заўжды выконвала КДБ. У пастарунку многія зь іх самі вельмі ўражваліся з гэтых затрыманьняў. Асабліва цяжка міліцыянтам было зразумець, навошта ім загадваюць канфіскоўваць праваабарончую літаратуру для непаўнагадовых. Здавалася б яны наадварот павінны спрыяць распаўсюду гэтае інфармацыі, - так пракамэнтаваў падзеі адзін з салігорскіх маладафронтаўцаў.

Алесь Міхалок

“Шоў Беларушчыны” ў Салігорску

Адразу ў трох клясах адной са школ зладзілі адмысловую віктарыну пад назвай “Шоў Беларушчыны” салігорскія актывісты Маладога Фронту. Віктарына складаецца з трыццаці пытаньняў у розных сфэрах: гісторыі, літаратуры, культуры і спорту Беларусі. Пераможца вызначаецца па агульнай колькасьці набраных балаў. Як адзначаюць арганізатары, хлопцы ды дзяўчаты паказалі добрае веданьне беларускай літаратурнай ды гістарычнай спадчыны. Лідэр дэмакратычнай моладзі Салігорска старшаклясьнік Іван Шыла лічыць такія спаборы вельмі добрым спосабам абуджэньня нацыяльнай самасьвядомасьці моладзі. “Першыя два конкурсы пасьпяхова праведзеныя ў адной са школ горада яшчэ ў сьнежні мінулага году”, - паведаміў адзін з арганізатараў мерапрыемстваў. - У іх паўдзельнічалі каля 30 чалавек”.

Праграмы па развіцьцю і падтрымцы беларускамоўнага Інтэрнэту.

Ужо некалькі месяцаў Беларускі Маладзёвы Рух Амэрыкі ажыцяўляе праграму па развіцьцю і падтрымцы беларускамоўнага інтэрнэту.
Беларусы Амэрыкі прапануюць бясплатны хостынго і рэгіструюць дамэн.Канчатковае мэта праграмы-зьўленьне вэб-прадстаўніцтваў кожнага беларускага горада і мятэстэчка.
Сёньня можна падвесьці першыя вынікі.
З дапамогаю Беларускага Маладзёвага Руху Амэрыкі адчыніліся сайты Менску,Салігорску,Слуцку,Пінску,Вілейкі.Цягам наступных тыдняў мусяць распачаць працу сайты Смалявічаў і Баранавічаў.
Кожны беларус можа скарыстацца паслугамі і бясплатна атрымаць інтэрнэт-пляцоўку.Адзіная ўмова-беларускамоўнасьць сайта.Салігорскі "Малады Фронт" з дапамогаю Беларускага Маладзёвага Руху Амэрыкі ажыцяўляе лякальную праграму па падтрымцы беларускамоўных праектаў.
Салігорцы гэтак сама аказваюць дапамогу ў распрацоўцы дызайну і коду.Літаральна ўчора распачаў працу інфармацыйны сайт Слуцаку.Наведаць яго мажліва па адрэсе slucak.org.

Агулам на Случчыне пяць праектаў ужо карыстаюцца бясплатным хостынгам і створаны "маладафронтаўцамі":газэты "Свабодны Салігорск","Салідарнасьць Салігорску","Музычны Форум","Слуцак.орг".

Праграмы па разьвіцьцю беларускамоўнага інтэрнэту-перспэктыўны накірунак дзейнасьці,істотны ўнёсак у папулірызацыю беларускай мовы. Ды вэб-прадстаўніцтвы гарадоў з кожным днём пашыраюць кола сталых наведвальнікаў:павялічэньне колькасьці карыстальнікаў сусьветкага Сеціва і ўзрост цікавасьці насельніцтва да інфармармацыі ў электроным выглядзе.

Калі ў Вас ёсьць жаданьне атрымаць дапамогу, зьвяртайцеся на belmov.org і калі ў Вас ёсьць жаданьне аказайць дапамогу, зьмяшчайце банэры й спасылкі на сваіх сайтах,форумах,блогах.

Віктар Радзько.

Дзень Салідарнасьці. Меркаваньні ўдзельніка.

Звычайныя некалькі дзесяткаў міліцыянтаў з відэа-камэрамі і ланцуг Салідарнасьці з сьвечкамі ў руках.

Чым розьнілася гэтая акцыя ад папярэдняй?Кіроўцы аўтамабіляў праязджалі занадта марудна,каб паглядзець, відэа здымка была вельмі "апэратыўнай":удзельнікі мелі час перадаць прывітаньні знаёмым ды шчэ сказаць некалькі словаў.

Ды і колькасьць удзельнікаў крыху пабольшылася. Як і заўсёды, гэта ў асноўным маладзёны, але ўсё больш людзей сярэдняга і сталага ўзросту прыходзіць 16-га а 20-00 гадзіне на цэнтральную плошчу.
Што далей?Будзем стаяць. Пакуль улады не правядуць расьледваньні зьнікненьняў палітыкаў,пакуль не будуць вызвалены палітвязьні,пакуль не будуць парушацца правы чалавека.

16 студзеня . Цэнтральная плошча . Дзень Салідарнасьці

За "кепскае выхаваньне"

24 студзеня на паседжаньні чарговае камісіі па справах непаўнагадовых, бацькоў маладафронтаўца Андруся Тычыны пакаралі штрафам 93 тыс. рублёў.
Івану Шылу камісія вынесла папярэджаньне за парушэньне закона аб друку і выбарчага заканадаўства.Моладзевых актывістаў затрымалі 4 студзеня за распаўсюд улётак з заклікам да байкоту выбароў і вывешваньне транспаранту адпаведнага зьместу.Цягам некалькіх тыдняў братоў Шылаў і Андруся Тычыну чакае шчэ адна камісія. Нагадаем, на мінулых выходных міліцыя і КДБ правялі шэраг затрыманьняў, каб сарваць акцыі на Случчыне.Адзін з удзелькаў, Зьміцер Карноў 23 студзеня, адбыўшы трохдзенны арышт выйшаў на волю.

З Салігорску выехаць немагчыма.Гледзячы каму...

14 студзеня салігорскімі супрацоўнікамі ДАІ былі затрыманы сябры "Маладога Фронта" Андрусь Тычына,Іван і Ільля Шылы і таксама каардынатар БХК Леаніда Мархотку.Са словаў праваабаронцы,у дзень выбараў выезд з гораду кантраляваўся міліцыянтамі. Аўтамабілі і маршруткі спыняліся для праверкі дакумантаў і дагляду транспарту.Апазыцыянэры пакінулі машыну непадалёк і вырашылі пешшу прайсьці пост ДАІ,каб спраўдзіць інфармацыю, што выезд з Салігорску "заблякаваны". На сваім уласным досьведзе яны ўпэўніліся, што інфармацыя адпавядае рэчаіснасьці.З гораду выпускаюць усіх,акрамя дэмакратычных актывістаў.Як паведаміў Леанід Мархотка,іх схапілі без тлумачэньняў і адвезьлі ў пастарунак.Затрыманых даставілі ў Салігорскі РАУС. Леанід Мархотка які прад'явіў пасьведчаньне журналіста і неўзабаве быў хутка вызвалены. З маладзёнамі правялі прафілактычную размову.Як патлумачылі ў міліцыі,яны затрыманы за парушэньне правілаў дарожнага руху. Аднак, размова не тычылася аніякіх правілаў-асноўнай тэмай была адыходзячая акцыя Салідарнасьці 16 студзеня.З Іванам Шылам размаўлялі асабіста начальнік міліцыі паўкоўнік Захарчук А. і паўкоўнік зь Менску Хведарэнка. Яны таксама цікавіліся ў моладзевага актывіста будучымі дзеяньнямі апазыцыі. "Хутка пабачымся"-гэтымі словамі разьвітаўся паўкоўнік Хведарэнка.

КІРАЎНІКІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ САЛІГОРСКУ ПРЫМУШАЮЦЬ ЛЮДЗЕЙ ГАЛЯСАВАЦЬ

На прыканцы тыдня датэрміновага галясаваньня кіраўнікі прадпрыестваў САЛІГОРСКУ па загаду ідэалягічнага адзьдзелу Салігорскага райвыканкаму пачалі прымушаць сваіх работнікаў зьявіцца на ўчастках для галясаваньня.

Так кіраўнікі будаўнічых упраўленьняў ААТ "Салігорскпрамбуд" загадалі адпускаць людзей раней з працы каб тыя зьявліся на датэрміновае галясаваньне. Дайшло да таго, што дырэктары прадпрыемстваў асабіста тэлефануюць сваім падначаленым з патрабаваньнем прыйсьці на ўчастак і памячаюць галачкамі тых, хто адмаўляецца ўдзельнічаць у выбарах. Сытуацыю ўскладняе кантрактная сыстэма для працоўных паводле якой чалавека можна зволіць без аніякіх прычынаў па заканчэньні гадавога кантракту.

- Мне патэлефанаваў дырактар і сказаў каб я абавязкова пайшла галясаваць. У іншым выпадку ён абяцаў адзначыць маё імя галачкай. Сказаў, што ўсе такія адзначаныя імёны будуць перададзены ў ідэалягічны адзьдзел выканкаму. Я разумею, што дырэктара таксама прымушаюць, яго таксама могуць зволіць, яму таксама трэба карміць дзяцей. Але ж гэта проста адваротна. Усе разумеюць, што кіраўнікі прадпрыемстваў павінны займацца сваімі гаспадаркамі, а не прымушаць людзей да галясаваньня. Гэта ж як за савецкім часам, калі яўка была 99.9%, проста жах, - паведаміла прэс-службе Салігорскай філіі МФ супрацоўніца аднаго з прадпрыемстваў Салігорску, якая па зразумелых прычынах пажадала каб яе імя не агучвалася.

- Увечары ў пятніцу мне патэлефанаваў начальнік і загадаў каб я адпусьціў людзей на гадзіну раней і накіраваў іх на выбарчыя участкі. Безумоўна я быў вымушаны гэта зрабіць. Іншага выбару ў мяне не было. Ён жа начальнік, - кажа майстар аднаго з будаўнічых упраўленьняў ААТ "Салігорскпрамбуд".

Прадстаўнік Беларускага Хельсінскага Камітэту ў Салігорску Леанід Мархотока так пракамэнтаваў дадзеныя факты:

- Гэта безумоўна так. Гісторыя паўтараецца ад выбараў к выбарам. Да нас паступаюць шматлікія скаргі ад выбарцаў па дадзеных фактах. Хацелася б нагадаць, што дадзеныя паводзіны кіраўнікоў салігорскіх прадпрыемстваў груба парушаюць артыкул 5 Выбарчага Кодэксу, які сьцьвярджае, што "выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў Дэпутатаў зьяўляюцца свабоднымі: выбарца асабіста вырашае ці ўдзельнічаць яму ў выбарах". Таму па такіх фактах можна й трэба зьвяртацца ў пракуратуру. Нажаль пры цяперашнім рэжыме гэта наўрад ці прынясе станоўчы вынік. Да таго ж дадзены стан рэчаў істотна ўскладняе ўсеагульная кантрактызацыя працоўных. Але ж трэба разумець што гэтая ўлада ня вечная. Усе факты парушэньня выбарчага заканадаўства фіксуюцца дакумэнтальна. З гэтае прычыны я параіў бы ўсім такім кіраўнікам падумаць пра будучыню і пра будучыню сваіх жа дзяцей. Прыйдзе час і за ўсе гэтыя злачынствы прыйдзецца несьці адказнасьць.

Прэс-служба Салігорскае філіі МФ

У Старобіне адкрылася новая паліклініка

Яе аўральна ўводзілі ў лік дзеючых з дапамогай будаўнікоў хіба ці не паловы Меншчыны. Чаму так сьпяшаліся? Каб пасьпець да выбараў прадэманстраваць клопат вэртыкалі пра народ.
Гэта сакавіку. Аднак ужо цяпер на адкрыцьці прысутнічалі знакавытолькі частка Старобінскай бальніцы, увод у эксплюатацыю якой плянуецца ў я асобы мясцовай вэртыкалі: старшыня Менскага аблвыканкаму Нікалай Дамашкевіч і новы старшыня Салігорскага райвыканкаму Аляксандар Рымашэўскі. Было многа сказана пра шчырасьць клопатаў вэртыкалі аб дабрабыце людзей. Але ж ці ўсё так выдатна?
Па першае, хацелася б адзначыць, што будоўля гэтае бальніцы цягнецца не два апошнія месяцы, а ўжо сямнаццаць год. Але ж у кастрычніку 2006 года ў Сатробіне зьяўляецца спадар Дамашкевіч і бліжэйшыя два месяцы амаль для тысячы будаўнікоў з усёй Меншычыны пераўтвараюцца ў сапраўдны вэрхал.
Дырэктар ААТ "Салігорскпрамбуд" Ашэйчык Нікалай Захаравіч тэрмінова накіроўвае сюды нябачную колькасьць людзей . Прыцягваюцца нават сілы зь Менску ды Маладэчна. Людзям даводзіцца працаваць па дванаццаць гадзінаў у суткі, па суботах і нават нядзелях. А калі напярэдадні каталіцкага Раства Хрыстова ўся краіна адпачывала тры дні, у Старобіне рабочым прыходзілася працаваць усе выходныя. Нават была спроба прымусіць людзей выйсьці на будоўлю і 25 сьнежня.
Будаўнікі ўвесь час скардзяцца, што ня бачаць сваіх семьяў, ня могуць займацца сваімі хатнімі справамі, якіх з кожным тыдням назапашваецца ўсё больш і больш. А пра звычайны адпачынак і казаць няма чаго. Часу застаецца, хіба што паесьці, бо зноўку трэба класьціся спаць: зранку ж на працу. Лінейныя інжынэры скардзяцца, маўляў Ашэйчык зарабляе сабе чарговыя мэдалі і прагінаецца перад прэзыдэнтам, а людзей за людзей ня лічыць.
Нехта нават прыпомніў, як паважаны дэпутат Нікалай Захаравіч, яшчэ пад час крызісу з продажам калійных соляў на Беларускаліі, загадаў прымусіць рабочых працаваць у выходныя пад пагрозай звальненьня. Маўляў калійны гігант стаіць, а людзям на Салігоршчыне падзецца больш няма куды: альбо "Белкалій" альбо "Салігорскпрамбуд". Таму будуць і ў выходныя працаваць.
Мясцовым уладам напярэдадні выбараў патрабавалася паказаць сваё дбаньне і клопат пра шчасьце народа. А тое, што сямнаццаць год гэта нікога не хвалявала, тое што людзі, як парабкі, без выходных і нармалёвага адпачынку да ночы ўкалываюць, тое што якасьць гэтых звыштэрміновых работ будзе нулявая, гэта ж нікога зь мясцовай вэртыкалі не цікавіць.
Вось так і атрымліваеецца, што беларусы ўжо на працягу амаль трынаццаці год у мірны час штодзень вядуць нейкія бітвы: за ўраджай, за аграгарадкі, за бібліятэкі і лядовыя палацы, адным словам - за стабільнасьць! Застаецца толькі адное пытаньне: а жыць калі?

Алесь Міхалок

Газэта Свабодны Салігорск
Выдаецца пры інфармацыйнай падтрымкі Салігорскага Маладога Фронта ды сайта САЛІГОРСК.org
Адказнасьць за зьмешчаны матэр'ялы нясуць аўтары.
Сувязь:
Тел: +375 29 370-02-04 +375 29 379-58-99
E-mail: salihorsk@gmail.com
http://gazeta.saligorsk.org
Надрукавана на асабістам абсталяваньні Драбудзькі М.М.
г. Кікоры , Папуа-Новая Гвінэя 22.01.07
Наклад 299 ас.